Галоўнае ўпраўленне адукацыі Гродзенскага аблвыканкама
Аддзел адукацыі Воранаўскага райвыканкама
Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Забалацкая сярэдняя школа імя Я.Н.Карпянкова”






# ПРАЕКТ
# “#МЫнашчадкі”




Аўтар:
Коцік ВалянцінаУладзіміраўна,
кіраўнік фальклорнага клуба “Спадчына”,
намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце
ДУА “Забалацкая сярэдняя школа імя
Я.Н.Карпянкова”
Воранаўскага раёна
Гродзенскай вобласці





Забалаць, 2023

Змест праекта

Пашпарт праекта……………………………………………………………..4
Уводзіны……………………………………………………………………...6
1.Школьнае краязнаўства – аснова фарміравання нацыянальнай самасвядомасці…………………………………………………………………7
2.Турысцка-краязнаўчая дзейнасць клуба “Спадчына”…………………...……8
Заключэнне………………………………………………………………......16
Спіс выкарыстаных крыніц………………………………………………..17
Дадаткі……………………………………………………………...………18
Дадатак 1. Праект “Захаваем спадчыну для нашчадкаў”……………………18
Дадатак 2. Радаводы сям’і…………………………………………………18
Дадатак 3. Зборнік песень в.Курчоўцы……………………………………...19
Дадатак 4. Інтэрв’ю з землякамі…………………………………………...20
Дадатак 5. Распрацоўкі ўрокаў, заняткаў, забаў, пазакласных мерапрыемстваў, сцэнарыяў свят і абрадаў…………………………………………..…22
Дадатак 5.1.“У вянок роднай мове” да Міжнароднага дня роднай мовы……22
Дадатак 6. Фотаматэрыялы фальклоных свят і абрадаў…………………..…22
Дадатак 6.1. Запрашаем на Камаедзіцу…………………………………...22
Дадатак 6.2. Вялікдзень……………………………………………………....22
Дадатак 6.3. Саракі……………………………………………………….....23
Дадатак 6.4. Курчоўскія калядкі……………………………………………..23
Дадатак 6.5. Забалацкі кірмаш……………………………………………24
Дадатак 6.6. Вячоркі ў Забалаці……………………………………….....…24
Дадатак 6.7. Уваходзіны…………………………………………………..….25
Дадатак 6.8. Багач……………………………………………………………..25
Дадатак 6.9. Масленіца……………………………………………………26
Дадатак 7. Фальклорнае свята “Вячоркі” на тэлеканале БТ-3 у праграме “Наперад у мінулае”………………………………………………………..26
Дадатак 8. Выступленне на раённым жнівеньскім педсавеце “Прэзентацыя ўстановы адукацыі”……………………………………………………...26
Дадатак 9. Дадатак 9. Відэаролік праекта “#Мынашчадкі”………………… 26
Дадатак 10. Публікацыі ў сродках масавай інфармацыі…………………… ....27

Пашпарт праекта

Назва праекта: “#МЫнашчадкі”

Тып праекта: краязнаўча-этнаграфічны

Адукацыйная вобласць: выхаваўчая работа

Мэта праекта: працяг працы па зборы, захаванні і рэканструкцыі мясцовых традыцый, звычаяў і абрадаў; выхаванне нацыянальнай самасвядомасці навучэнцаў праз арганізацыю краязнаўчай работы.

Задачы праекта:

1. Стварэнне творчай групы для рэалізацыі праекта.
2. Сумесная дзейнасць жыхароў рознага ўзросту Забалацкага і Місявічскага сельскіх выканаўчых камітэтаў у рэалізацыі мерапрыемстваў праекта па адраджэнні культурна-гістарычнай спадчыны малой радзімы.
3. Сістэматычнае размяшчэнне вынікаў працы (фота-, відэа) на сайце ўстановы адукацыі і ў СМІ, правядзенне майстар-класаў разам з мясцовымі жыхарамі.
4. Арганізацыя тэатралізаваных прадстаўленняў фальклорных святаў і абрадаў на школьнай сцэне і сцэнах Забалацкага, Місявіцкага і Курчоўскага цэнтраў культуры і вольнага часу.
5. Папаўненне старонкі “Захаваем спадчыну для нашчадкаў” матэрыяламі праекта “#Мынашчадкі” на сайце дзяржаўнай установы адукацыі “Забалацкія сярэдняя школа імя Я.Н.Карпянкова” з мэтай павышэння цікавасці падрастаючага пакалення да малой радзімы.

Гіпотэза: захаванне і перадача традыцый уплывае на грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення.

Для дасягнення азначанай мэты, выканання пастаўленых задач выкарыстоўваюцца наступныя формы і метады арганізацыі дзейнасці: складанне радаводаў, запіс успамінаў, арганізацыя фальклорных святаў і абрадаў, сустрэчы са знакамітымі людзьмі, прадстаўнікамі розных прафесій, экспедыцыі, вандроўкі, завочныя падарожжы, паходы і велапаходы, экскурсіі.

Матэрыял прадстаўленага праекта можна выкарыстоўваць на ўроках літаратуры, гісторыі, на выхаваўчых мерапрыемствах адпаведнай тэматыкі, у рамках арганізацыі мерапрыемстваў шостага школьнага дня. У гэтым заключаецца яго практычная значнасць.

Формы прадстаўлення вынікаў:

- сцэнарыі мерапрыемстваў;
- фотаілюстрацыі;
- малюнкі;
- відэаролікі;
- публікацыі ў СМІ.

Тэрмін рэалізацыі: 2021-2023 гг.

Удзельнікі праекта: творчая група з прадстаўнікоў сферы адукацыі і культуры, грамадскасці аграгарадкоў Забалаць і Місявічы, вёскі Курчоўцы.

Групы: вучні, іх бацькі, педагогі ўстановы адукацыі, мясцовыя жыхары, спецыялісты ўстаноў культуры, госці і наведвальнікі нашай мясцовасці.

Партнёры:

- Аддзел адукацыі Воранаўскага райвыканкама;
- Забалацкі і Місявіцкі сельскія выканаўчыя камітэты;
- Рэдакцыя “Воранаўскай газеты”;
- Школьны этнаграфічны музей “Спадчына”;
- Цэнтры культуры аг. Забалаць, аг. Місявічы, в.Курчоўцы.

Механізм рэалізацыі:

Работа арганізуецца ў двух асноўных блоках:

1. “Адраджэнне рамёстваў” (навучанне мясцовым рамёствам: ткацтву, вышыўцы, выцінанцы, лепцы з гліны, саломапляценню, прыгатаванню ежы; фіксацыя з дапамогай фота-, відэатэхнікі, афармленне матэрыялаў).
2. “Мясцовы абрады і традыцыі” (удзел у мясцовых святах, звычаях, абрадах, гульнях, этнаграфічных экспедыцыях; фіксацыя з дапамогай фота-, відэатэхнікі, афармленне матэрыялаў).

Мэрапрыемствы першага блока з’яўляюцца часткай падрыхтоўчай дзейнасці да святаў, кірмашоў, выстаў.

*«Радзіма - яна як мама.*
*Яе трэба любіць ужо за тое, што яна ёсць ... »*

## Уводзіны

Мінаюць гады, прабягаюць стагоддзі, але нязменным застаецца адно – мудрасць людскіх пакаленняў, якія жылі на нашай зямлі. Гэта наш скарб, наша бясцэнная каштоўнасць. Гісторыя – гэта змена пакаленняў. Што пакінем нашчадкам? Ці зможам захаваць і беражліва перадаць лепшае, што ёсць у нас?

Праблема патрыятычнага выхавання ў апошні час стала адной з самых актуальных.

З улікам тэматыкі Года малой радзімы на працягу трох год (2019-2021) ва ўстанове адукацыі рэалізоўваўся праект шостага школьнага дня «Захаваем спадчыну для нашчадкаў» (Дадатак 1), які быў накіраваны на выхаванне навучэнцаў у духу любові да Айчыны, захаванне і прымнажэнне нацыянальнага духоўнага і культурнага здабытку малой радзімы, яе гістарычнай спадчыны, прыродных багаццяў, самабытных традыцый землякоў.

Праект дазволіў праводзіць працу з улікам усіх напрамкаў Канцэпцыі і Праграмы бесперапыннага выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь, пашырыць і ўмацаваць сувязі з бацькоўскай грамадскасцю і соцыумам. Праца ў праекце закончана, але так, як асноўны накірунак дзейнасці нашай установы адукацыі – краязнаўча-этнаграфічны, быў складзены новы праект “#Мынашчадкі” з улікам магчымасцей і пажаданняў навучэнцаў, педагогаў і бацькоўскай грамадскасці, які будзе працягам той працы, якая арганізавана.

Выхаванне падрастаючага пакалення на традыцыях беларускай народнай культуры мае вялікае значэнне. Гэта вельмі актуальна ў Год гістарычнай памяці(2022), Год міру і стварэння (2023) для фарміравання цікавасці да гісторыі свайго народа, духоўнай і культурнай спадчыны малой радзімы і краіны ў цэлым.

Вядома, малая радзіма адыгрывае значную ролю ў фарміраванні жыццёвай пазіцыі кожнага чалавека. Нам, вучням, цікава даведацца сутнасць абрадаў, пакінутых у спадчыну продкамі, змест розных рытуальных сітуацый, сэнс ужывання, напрыклад, ручніка, каравая, падковы, зоркі, практычнага прымянення вышыўкі, выцінанкі, ткацкіх вырабаў як сродкаў упрыгожання жылля і адзення, ролі народных свят у сям’і. Людзі старэйшага пакалення дапамагаюць нам дакрануцца да мясцовых традыцый і звычаяў. З вялікай цікавасцю навучэнцы вывучаюць свой радавод, складаюць радаслоўныя дрэвы сваёй сям’і. Бацькі, бабулі і дзядулі нашых навучэнцаў актыўна падтрымліваюць такую зацікаўленасць.

Разам з тым існуе праблема: паступовае ідзе памяншэнне колькасці сталых людзей – носьбітаў сацыяльна-культурнага вопыту. Узнікае пагроза знікнення з людской памяці многіх традыцый, звычаяў нашай мясцовасці. На тэрыторыі Забалацкага і Місявіцкага выканаўчых камітэтаў ужо не засталося ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, але яшчэ жывуць “дзеці вайны”, якія памятаюць тыя

жудасныя падзеі і могуць расказаць нам, падрастаючаму пакаленню, аб падзеях вайны на тэрыторыі малой радзімы.

Каб не дапусціць знікнення спадчыны, а захаваць і адрадзіць рамёствы і промыслы, гульні, святы патрэбна прадуктыўная сумесная дзейнасць моладзі і старэйшага пакалення па распрацоўцы стратэгіі зберажэння гісторыка-культурнай спадчыны Забалаці і вёсак мікрараёна. Гэта патрэбна ўсім, каб захаваць і перадаць спадчыну для нашчадкаў.

Для рэалізацыі задуманага ў нас ёсць усе неабходныя ўмовы, зацікаўленнасць партнёраў: па-першае, наладжана сувязь з сельсаветамі, аднавяскоўцамі, якія ахвотна дзеляцца сваімі ведамі, жыццёвым вопытам; па-другое, на базе ўстановы адукацыі ўжо даўно існуе этнагарафічны музей “Спадчына”, у якім сабраны багаты краязнаўчы матэрыял; па-трэцяе, ва ўстанове адукацыі арганізаваны аб’яднанні па інтарэсах краязнаўчага накірунку “Юныя этнографы”, “Юныя гісторыкі”, фальклорны клуб “Спадчына”.

## 1. Школьнае краязнаўства – аснова фарміравання нацыянальнай самасвядомасці

Заклiканне да патрыятызму – справа неэфектыўная і безвыніковая. Патрыятызм трэба выхоўваць. Мэтанакіраваная праца па выхаванні патрыятызму і грамадзянскасці з’яўляецца адной з задач выхаваўчай дзейнасці школы.

У апошнія гады дадзены накірунак дзейнасці ўсё актыўней уключаецца ў сістэму навучання і выхавання моладзі, “актуальным з’яўляецца пошук новых магчымасцей фарміравання ў юных грамадзян неабыякавых адносін да лёсу сваёй малой радзімы, краіны” [12.с 37], асабліва сёння, калі такая вялікая ўвага надаецца гэтаму пытанню з боку дзяржавы. Рэспубліка Беларусь, а таксама і наша Воранаўшчына,  славіцца багатай спадчынай, традыцыямі, якія неабходна захаваць і перадаць будучым пакаленням.

Вывучэнне гістарычнага мінулага дазваляе ўявіць карціну жыцця нашых продкаў, паказаць вытокі сучаснасці. З малых гадоў дзіця далучаецца да багатай і разнастайнай фальклорнай спадчыны свайго народа [4, с.3].

Паняцце «нацыянальная самасвядомасць» увялі этнографы для абазначэння этнічных прымет (У. І. Казлоў, Ю. У. Брамлей). Характарызуючы этнічную самасвядомасць, этнографы фіксавалі прыналежнасць людзей да вызначанага этнасу. Аднак этнографы займаюцца пытаннем самасвядомасці этнічнай агульнасці, мы ж спыняемся на этнічнай самасвядомасці асобы.

З’яўляючыся духоўным здабыткам асобы, нацыянальная свядомасць і гонар за свой край фарміруюцца ў сям’і. Мы разумеем, што любоў і павага да Бацькаўшчыны пачынаюцца менавіта з любові да бацькі і маці, да сваёй сям’і, да месца нараджэння і жыхарства. Любіць свой “родны кут – адсюль пачынаецца асабістае далучэнне да вялікай Радзімы” [9, с.4] і разуменне таго, што ты яе грамадзянін

Кожны адукаваны чалавек павінен ведаць традыцыі і мову свайго народа, павінен умець спяваць свае народныя песні, шанаваць народныя танцы, ведаць,

як з веку ў век праходзілі святы ў нашым краі, любіць свае родныя мясціны, сваю Радзіму – Беларусь. Таму ўсвядамленне таго, што, чым больш мы ведаем аб малой радзіме, тым мацнейшай і духоўна багацейшай будзе наша нацыя.

На працягу некалькіх год дзяржаўная ўстанова адукацыі “Забалацкая сярэдняя школа імя Я.Н.Карпянкова” мела статус этнашколы-сада, удзельнічала ў інавацыйным праекце “Этнашкола Панямоння”. Сабрана шмат краязнаўчага матэрыялу, які выкарыстоўваецца ў адукацыйным працэсе. Нягледзячы на тое, што зараз назва змянілася, традыцыі і дух этнашколы засталіся, сістэма работы ў гэтым накірунку працягваецца.

Пэўнай праграмай нашай дзейнасці з'яўляюцца зацверджаныя Міністэрствам адукацыі Усебеларуская турысцка-краязнаўчая экспедыцыя "Наш край" і рэспубліканская акцыя навучэнцаў і моладзі "Жыву ў Беларусі і тым ганаруся", удзел у якой актыўна прымаем і мы. Можна сказаць, што Палажэнне пра Усебеларускую турыстычна-краязнаўчую экспедыцыю “Наш край”, прынятае ў 1992 г., стала асновай для краязнаўчай працы. Яе галоўная задача – “сродкамі турызму і краязнаўства фарміраваць у моладзі пачуццё патрыятызму, дбайнага працаўніка і клапатлівага сем’яніна”.

## 2. Турысцка-краязнаўчая дзейнасць клуба “Спадчына”

Дзейнасць фальклорнага клуба “Спадчына” накіравана на выхаванне нацыянальнай самасвядомасці праз арганізацыю работы па зборы краязнаўчага матэрыялу. Асноўныя накірункі дзейнасці клуба – краязнаўства, арганізацыя фальклорных святаў і абрадаў, правядзенне экскурсій, паходаў, вандровак па родным краі, фальклорных экспедыцый і інш.
Мэта: замацаванне атрыманых падчас тэарэтычнага навучання ведаў аб ажыццяўленні краязнаўчай і экскурсійнай дзейнасці. Краязнаўчае аб’яднанне адкрывае навучэнцам прыгажосць свету праз вывучэнне фальклору малой радзімы, арганізацыю і правядзенне фальклорных святаў і абрадаў на школьнай сцэне і выступленні на сцэнах сельскіх цэнтраў культуры аг.Забалаць, аг. Місявічы і в. Курчоўцы, выступленнях перад гледачамі Бастунскага аддзялення круглпсутачнага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту і інвалідаў, УА “Радунскі ДСПЦ”, Астрынскай СШ Шчучынскага раёна.

Вядучую ролю ў гэтай рабоце адыгрывае школьны этнаграфічны музей “Спадчына”, у якім арганізавана работа па зборы і захаванні спадчыны роднага краю.

Краязнаўчая дзейнасць у клубе пачынаецца са складання радавода сям’і. Пачынаючы з 5 класа, штогод вучні ўдзельнічаюць у школьным конкурсе радаводаў (Дадатак 2) (“Летапіс маёй сям’і”), які арганізаваны праз розныя формы(намінацыі):
1. Радаводнае дрэва з фотаздымкамі і каментарыямі пра сваіх продкаў (Дадатак 2).

2. Фотаальбом з каментарыямі і запісанымі ўспамінамі каго-небудзь са сваякоў.

3. Эсэ “Гісторыя кахання”: раскажыце пра самую прыгожую гісторыю кахання ў вашай сям’і.

4. Эсэ “Лёсавызначальная падзея”: пра падзею, што змяніла лёс вашага роду.

Праведзеная работа паказала, што складанне радаводаў — гэта адзін з актыўных метадаў далучэння да дыялогу пакаленняў. Бацькі, бабулі і дзядулі ўдзельнічаюць ва ўсіх этапах гэтай справы, прыходзяць падтрымаць дзяцей падчас прэзентацыі радаводу. Яны выказваюць вялікую зацікаўленасць мерапрыемствамі, якія патрабуюць калектыўнага абмеркавання і звязаны з этнапедагагічнай праблематыкай. На пасяджэннях клуба “Сям’я” абмяркоўваюцца тэмы: “Звычаі і традыцыі беларускага народа ў сямейным выхаванні”, “Народныя прыкметы ў выхаванні дзяцей”, “Традыцыі сям’і – прыклад для будучага дзяцей”, “Мой радавод: чаму патрэбна выхоўваць дзяцей на прыкладах славутых продкаў?” і інш.

Бацькі дапамагаюць збіраць казкі, загадкі, прымаўкі, прыказкі, калыханкі, пацешкі; запісваюць разам з дзецьмі песні і танцы, якія спявалі і танцавалі бабулі і дзядулі. Багаты мясцовы матэрыял сабраны ў зборнік песень, якія па сваім характары, музычных і зместавых асаблівасцях, па жанрах і манеры выканання вельмі блізкія і нам, беларусам, і ўкраінцам, якія жывуць на тэрыторыі нашага раёна. На прыкладзе аматарскага фальклорнага аб’яднання “Курчоўскія напевы” (кіраўнік Васько В.І.) быў складзены зборнік песень в. Курчоўцы (Дадатак 3).

Намаганнямі краязнаўчага аб’яднання штогадова ажыццяўляюцца вандроўкі па Беларусі з наведваннем аб’ектаў гісторыка - культурнай спадчыны. На працягу апошніх гадоў ўдзельнікі клуба “Спадчына” наведалі гарады Ліда, Гродна, Мір, Навагрудак, Нясвіж, Жодзіна, Мінск. Штогод распрацоўваюцца новыя экскурсійныя маршруты па малой радзіме “Сцяжынкамі Бацькаўшчыны”.

Паходы – адзін з нашых любімых заняткаў па правядзенні вольнага часу з карысцю для себе і для роднай школы.

Штогод вясной-летам ва ўстанове арганізоўваюцца паходы (велапаходы) і экскурсіі па родных мясцінах. Удзельнічаючы ў паходах і экскурсіях па роднай Забалаці, навучэнцы могуць не толькі прайсціся па знаёмых вулачках, але і даведацца шмат цікавага пра іх назвы: “Вуліцы майго аграгарадка”, “Пагранічная застава “Забалаць”, “Любімыя мясціны аграгарадка”, “Вуліца Нарбута” і інш.

Актыўнай формай работы з’яўляюцца этнаграфічныя экспедыцыі-вандроўкі ў акаляючыя вёскі, падчас якіх адбываюцца сустрэчы з жыхарамі – носьбітамі народнай спадчыны. Каб вандроўка атрымалася цікавай і змястоўнай, да яе загадзя ідзе падрыхтоўка: вывучаюцца матэрыялы пра аб’екты, якія плануецца наведаць; размяркоўваюцца абавязкі паміж настаўнікам і вучнямі. У кожнага з нас, хто адправіўся ў паход, развіваецца пачуццё адказнасці не толькі за свае ўчынкі, але і за ўсіх членаў похода (экскурсіі).

Перад паходам для навучэнцаў праводзіцца кансультацыя па зборы фальклору і формах фіксацыі інфармацыі. Пасля паходу (велапаходу) падводзяцца вынікі, высняецца, што было цікавага, што не ўдалося, чаму. Матэрыялы паходу афармляюцца ў альбоме, артыкулах у газету ці інфармацыя змяшчаецца на школьным сайце. Гэта спрыяе развіццю арфаграфічнай пільнасці, мастацкага афармлення, умення перадаць сабраны матэрыял у цікавай і змястоўнай форме. Пры гэтым навучэнцы спасцігаюць першыя крокі ў прафесію мастака-афарміцеля, рэдактара і інш.

Удзельнікамі клуба распрацаваны турыстычныя маршруты па вёсках не толькі нашага раёна, але і Шчучынскага, і Лідскага. Пры зборы матэрыялу пра знакамітых землякоў мы маем магчымасць пакланіцца магілам дзядоў і прадзедаў, людзям, якія праславілі наш край, падарылі нам мір і шчасце. А маршруты паходаў розныя: “Забалаць–Пасека–Дварчаны”, “Забалаць – Запрудзяны – Смільгіні–Дубінцы”. Сабраная інфармацыя афармляецца ў выглядзе даследчых прац, з якімі навучэнцы выступаюць на раённай навукова-практычнай канферэнцыі “Дарога ў будучыню” і абласной навукова-практычнай канферэнцыі “Край Гарадзенскі”.

Актыўным відам адпачынку і пазнання малой радзімы з’яўляюцца велапаходы, якія арганізоўваюцца ў рамках праекта “Экалагічнымі сцежкамі малой радзімы”: “Забалаць – Навасады – Місявічы – Мантуны”, “Забалаць – Валэйшы – Стары Двор– Васілішкі – Старыя Васілішкі – Мантуны – Навасады – Забалаць”, дзе школьнікі не толькі наведваюць дзядоўскія крынічкі, якія шмат год б’юць з-пад зямлі, наталяючы смагу вандроўнікам, але і сустракаюцца з народнымі ўмельцамі, якія з цікавасцю распавядаюць пра вышыўкі, ткацтва, саломапляценне. Часта такія сустрэчы афармляюцца ў выглядзе інтэрв’ю (Дадатак 4). Аб паходах і экскурсіях па родных мясцінах пішуць сачыненні, эсэ на ўроках, факультатывах і пасяджэннях літаратурнага клуба “Пегасік”. Вершы (замалёўкі) пра родны край, яго прыроду, пра родных і блізкіх людзей – адна з галоўных тэм (Дадатак 5). У час правядзення літаратурных гасцёўняў-сустрэч са сваімі вершамі пачынаючыя паэты выступаюць на школьнай і раённай сцэнах, удзельнічаюць ў творчых конкурсах і вечарынах (Дадатак 6).

Турысцка-краязнаўчая работа клуба “Спадчына” была арганізавана праз ўдзел у праекце шостага школьнага дня “Захаваем спадчыну для нашчадкаў”, дзейнасць якога была накіравана на выхаванне вучняў у духу любові да Айчыны, на захаванне нацыянальнага духоўнага і культурнага здабытку малой радзімы, яе гістарычнай спадчыны, прыродных багаццяў, самабытных традыцый землякоў.

Удзел у праекце “#МЫнашчадкі” дае магчымасць паглыбіць веды аб традыцыях малой радзімы, пашырыць і ўмацаваць сувязі з бацькоўскай грамадскасцю і соцыумам. Установай адукацыі і школьным этнаграфічным музеем “Спадчына”, які з’яўляецца цэнтрам краязнаўчай работы, наладжана супрацоўніцтва з Забалацкім філіялам Радунскай школы мастацтваў, з аддзелам адукацыі Воранаўскага райвыканкама, раённым аддзелам культуры, Забалацкім і Місявіцкім сельскімі выканаўчымі камітэтамі, рэдакцыяй “Воранаўскай

газеты”, цэнтрамі культуры і вольнага часу аг. Забалаць, аг. Місявічы, в. Курчоўцы.

Работа ў праекце пачынаецца з дашкольнага звяна. Дашкольны ўзрост – найбольш спрыяльны перыяд для авалодвання дзецьмі элементамі беларускай народнай культуры. Менавіта ў гэты прамежак жыцця ў дзіцяці фарміруецца цікавасць, прага да ведаў, якія адпавядаюць яго прыродным і асабістым задаткам, закладваецца трывалы фундамент ведаў. Кажуць, традыцыі працягваюць жыццё ў дзецях. І асабліва вясковых. Гэтаму спрыяе сельскае асяроддзе — калыска народнай культуры. А яе праваднікі — вясковыя бабулі-дзядулі, якія перадаюць з вуснаў у вусны казку ці легенду, абрад ці паданне, песню або танец.

На аснове краязнаўчага матэрыялу, які знаходзіцца ў этнаграфічным музеі “Спадчына” [3,с.57], распрацоўваюцца гульнёва-пазнавальныя мерапрыемствы, фальклорныя святы (“Вячоркі”, “Калыханка”, “На свята да бабулі Агаты”, “Запрашаем на Камаедзіцу” (Дадатак 6.1), “Гуканне вясны”, “Свята сонца і вясны”) для дашкольнікаў. Пры падрыхтоўцы да фальклорна-музычных забаў (“Усе мы з бабуліных, дзядулевых далоняў…”) дашкольнікі вучацца іграць на дзіцячых музычных інструментах, развучваюць народныя песні і танцы “Трасуха”, “Рэпка”, “Панначка”, “Крыжачок” і інш.

Важна, калі дзіця чуе калыханку з вуснаў маці, а яшчэ важней, калі яно выконвае яе на малой сцэне сваёй дашкольнай установы, а гледачамі і нават удзельнікамі становяцца бацькі.

Падчас падрыхтоўкі абраду складаецца сцэнічны план, размяркоўваюцца ролі, развучваецца музычны рэпертуар. У падрыхтоўцы рэквізіту актыўны ўдзел прымаюць бацькі. Затым падрыхтаваны абрад праводзіцца ў адпаведнасці з “народным календаром” [11,с.36]. Назапашваецца тэкставы, харэаграфічны матэрыял.

Школьнікі на факультатывах падчас вывучэння веснавой абраднасці беларусаў знаёмяцца з вясеннімі абрадамі і святамі: “Вялікдзень” (Дадатак 6.2), “Саракі” (Дадатак 6.3), “Масленіца” (Дадатак 6.9), “Гуканне вясны”, “Свята сонца і вясны…”, свята “Юр’я”, [10, с.59].

Летні цыкл абрадаў і святаў прадстаўлены тэатралізаванымі святамі “Купалле”, “Зажынкі”[2, с.67], якія заўсёды праходзяць сумесна з Забалацкім цэнтрам культуры і вольнага часу.

Пры вывучэнні восеньскага абраднага цыклу праходзіць знаёмства са святамі: “Багач” (Дадатак 6.8),“Пакроўскія ігрышчы”, “Свята млынара”, “Забалацкі кірмаш” (Дадатак 6.5), “Дзяды”.

Знаёмячыся з зімовым абрадавым цыклам навучэнцы рыхтуюць тэатралізаваныя прадстаўленні фальклорных святаў і абрадаў: “Курчоўскія калядкі” (Дадатак 6.4) [6,с.4], “Калядная варажба дзяўчат”, “Вячоркі ў Забалаці” (Дадатак 6.6.) і інш.

Як рыхтаваць і праводзіць кожнае з гэтых святаў апісана ў сцэнарах, якія складзены сумесна з вучнямі і настаўнікамі школы на аснове сабранага матэрыялу падчас экскурсій-вандровак, фальклорных экспедыцый. Асабліва

падабаецца падлеткам збор матэрыялу, які прысвечаны сямейным абрадам. Гэта “Заручыны”, “Вяселле”, “Уваходзіны” (Дадатак 6.8) і інш. Мерапрыемствы часта праходзяць у школьным этнаграфічным музеі, што дапаўняе каларыт самога мерапрыемства. Дзеці з задавальненнем калышуць лялькy ў зыбцы, прасуюць бялізну з дапамогай валка і качалкі, з затоеным дыханнем трымаюць у руках запаленую грамнічную свечку і памінаюць сваіх блізкіх памерлых. Найбольш якаснае грамадзянскае станаўленне асобы адбываецца менавіта праз практычную дзейнасць.

Вынікам працы ў праекце “Захаваем спадчыну для нашчадкаў” быў паказ фальклорнага свята “Вячоркі”, якое было знята ў этнаграфічным музеі “Спадчына” і прадстаўлена сумесна з калектывам “Курчоўскія напевы” ў філіяле “Курчоўскі сельскі клуб” (арганізатары Коцік В.У. і Васько В.І.) у чэрвені 2021 года на беларускім тэлебачанні ў праграме “Наперад у мінулае”. Праграма выйшла ў эфір 18.07.2021 у 11.45 на канале БТ-3.(Дадатак 7).

На шчасце, традыцыі нашых продкаў яшчэ не забыты, яны жывуць у нашых душах. Праз шэраг святаў, экскурсій, паходаў дзеці далучаюцца да гістарычнай спадчыны, захоўваюць усё лепшае, што мае наш народ у сваёй скарбонцы, памнажаючы тыя нацыянальныя здабыткі, якія ўжо набыла незалежная Беларусь.

Мы прыйшлі да высновы, што трэба выхоўваць нацыянальную душу сродкамі беларускага фальклору. Як жа гэта рабіць? Па-першае, гэта душа павінна ўвабраць у сябе шмат станоўчых эмоцый, многае адчуць; па-другое, паглыбіцца ў гістарычнае мінулае свайго народа праз вывучэнне яго абрадаў і традыцый; па-трэцяе, шмат ведаць пра культуру нацыі, яе багатую духоўную спадчыну. У душах нашых дзяцей, як жывая крыніца, павінна бурліць і пераліваецца шчырая любоў да Бацькаўшчыны, якую можна назваць "золатам” душы чалавечай асобы, бо гэтая любоў дапаможа дзіцяці выстаяць, не зламацца ў наш час, час насілля і гвалту, які сыплецца на кволыя душы дзетак з тэлеэкранаў, інтэрнэту і які ідзе ад жорсткага прагматычнага жыцця. Нам так не хапае зараз любові. Душа ж павінна любіць, інакш яна будзе ненавідзець.

Каб любоў да Бацькаўшчыны праходзіла праз душу, трэба выхоўваць падрастаючае пакаленне на нацыянальных асновах. Стварэнне і рэалізацыя праекта “#МЫнашчадкі” з’яўляецца адным са шляхоў далучэння навучэнцаў да культурнай спадчыны продкаў.

## ЭТАПЫ І ПЛАН РЭАЛІЗАЦЫІ ПРАЕКТА

### Падрыхтоўчы этап

( верасень 2021 – кастрычнік 2021 гг. )

| Дзеянні | Тэрмін | Адказныя | Вынікі | Фактычныя выканаўцы |
|---|---|---|---|---|
| Пасяджэнне творчай групы | Верасень, 2021 | Коцік В.У., Мар’янская Л.П., старшыні Забалацкага і Місявічскага выканкамаў | Удакладненная стратэгія дзейнасці | Члены творчай групы |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Бацькоўскі сход. Прэзентацыя праекта | Верасень, 2021 | Коцік В.У., намеснік дырэктара па ВР, кіраўнік творчай групы | Зацікаўленнасць прадстаўнікоў мясцовай супольнасці удзелам ў праекце | Адміністрацыя ўстановы адукацыі, члены творчай групы |
| Круглы стол “Арганізацыя дзейнасці ў рамках праекта, размеркаванне абавязкаў” | Кастрычнік, 2021 | Кіраўніцтва праекта | Удакладненне плана, стварэнне рабочых груп, размеркаванне абавязкаў | Члены ініцыятыўнай групы, зацікаўленныя жыхары |

Асноўны этап
(лістапад 2021 – красавік 2022 гг.)

| Дзеянні | Тэрмін | Адказныя | Вынікі | Фактычныя выканаўцы |
|---|---|---|---|---|
| Свята “Багач” *(Дадатак 6.8)* *https://upk-zabolot.schools.by/photoalbum/711746* | Верасень, 2021, 2022 | Юндзіл А.В., Пакуліс Г.А., класныя кіраўнікі | Актыўнасць, рэалізаваныя ініцыятывы прадстаўнікоў мясцовай супольнасці | Навучэнцы 1-11 кл., мясцовыя жыхары, ЦКД аг.Забалаць |
| Свята “Пакровы” *https://upk-zabolot.schools.by/photoalbum/384969* | Кастрычнік, 2021, 2022,2023 | Крахмальчык В.Ю., Вільчэўскі Л.І., класныя кіраўнікі | Актыўнасць, паказ прадстаўлення на школьнай сцэне, артыкул у сродках масавай інфармацыі | Навучэнцы 9-11 кл., мясцовыя жыхары, ЦКД аг.Забалаць |
| Памінальны абрад “Дзяды” https://upk-zabolot.schools.by/photoalbum/391454 | Лістапад, 2021, 2022, 2023 | Войшніс Ф.С., Ясюкайціс М.М., Юндзіл А.В. | Фота-фіксацыя, актыўнасць. Добраўпарадкаваная могілкі аг.Забалаць | Кіраўніцтва праекта, навучэнцы 7-11 кл., мясцовыя жыхары |
| Творчы праект “Скарбонка краязнаўчых находак” | Лістапад, 2022 | Войшніс Ф.С. | Справаздача “Званок 1887 года—каштоўны музейны прадмет” | Атрад “Нашчадкі”, бацькі, жыхары в.Курчоўцы |
| Абрад “Калядкі” *(Дадатак 6.4)* | Снежань, 2021, 2023 | Пакуліс Г.А., класны кіраўнік | Відэа і фотаматэрыялы майстар-класа | Навучэнцы 5 кл, бацькі, мясцовыя жыхары |
| Свята “Дзіцячыя вячоркі” | Студзень, 2022; красавік, 2023 | Яшкевіч Г.Г., Глушань Л.І. | Відэаматэрыялы, артыкул у СМІ | Выхаванцы д/а, бацькі, педагогі |
| Свята “Масленіца” https://upk-zabolot.schools.b | Люты, 2022, 2023 | Юндзіл А.В. педагог-арганізатар, Кукліс Л.Ч., | Відэаролік, фота матэрыялы | Навучэнцы 6 кл., Забалацкі ЦКД, бацькі, аднавяскоўцы |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| y/photoalbum/619266 | | мастацкі кіраўнік Забалацкага ЦКД | | |
| Свята “Саракі” *(Дадатак 6.3)* | Сакавік, 2022 | Ненартовіч Г.Ч., класны кіраўнік | Паказ на школьнай сцэне, удзел у раенным анлайн-конкурсе “Саракі” | Навучэнцы 5-9 класаў, бацькі, мясцовыя жыхары, |
| Свята “Вялікдзень” *(Дадатак 6.2)* | Красавік, 2022 | Бернацкая В.А., Ясюкайціс М.М.., класныя кіраўнікі | Паказ дашкольнікам, Відэаматэрыялы, артыкул у СМІ | Навучэнцы 1-4 класаў, бацькі, мясцовыя жыхары |
| Кірмаш “Вясковыя прысмакі” | Красавік, 2022, 2023 | Коцік В.У., кіраўнік творчай групы Пакуліс Г.А., класны кіраўнік | Арганізацыя дэгустацыі страў беларускай кухні, складанне кнігі рэцэптаў страў, фотаматэрыялы | Навучэнцы 5-11 кл., педагогі, аднавяскоўцы |
| Свята “Юр’я” | Май, 2022, 2023 | Войшніс Ф.С., загадчык музея “Спадчына”, Чапля Р.І. | Паказ інсцэніроўкі ў музеі “Спадчына”, відэафіксацыя | Навучэнцы, бацькі, аднавяскоўцы |

Заключны этап
(май – верасень 2021 г.)

| Дзеянні | Тэрмін | Адказныя | Вынікі | Фактычныя выканаўцы |
|---|---|---|---|---|
| Творчая справаздача “Святы і абрады Забалатчыны” | Май, 2021, 2022, 2023 | Коцік В.У., кіраўнік творчай групы, класныя кіраўнікі | Прэзентацыя вынікаў праекта “#МЫнашчадкі” | Кіраўніцтва праекта, навучэнцы 1-11 кл., мясцовыя жыхары, ЦКД |
| Велапаход “Сцяжынкамі роднага краю” | Чэрвень, 2022 | Шлавенец І.Ю., класны кіраўнік | Фота (відэа)матэрыялы, публікацыі ў СМІ | Навучэнцы 9, 11 кл. |
| Майстар-клас ”Выцінанка” | Чэрвень, 2022, красавік, 2023 | Юндзіл А.В., педагог-арганізатар | Матэрыялы майстар-класа, выпуск брашуры | Выхаванцы аздараўленчага лагера., педагогі, бацькі |
| Падвядзенне вынікаў праекта “#Мынашчадкі” | Жнівень, 2023 | Кіраўнік творчай групы | Ацэнка якасці праекта, фота і відэаматэрыялы на старонках “Воранаўскай газеты”. | Кіраўнік творчай групы, навучэнцы 11 класа |
| Прэзентацыя старонкі “#МЫнашчадкі” на сайце ўстановы адукацыі | Верасень, 2023 | Коцік В.У., кіраўнік творчай групы | Папаўненне старонкі “Захаваем спадчыну для нашчадкаў” на сайце ўстановы адукацыі новымі матэрыяламі, водгукі гасцей старонкі | Кіраўніцтва праекта |

ВЫНІКІ ПРАЕКТА:

1. Новы ўзровень партнерскіх узаемаадносін, кансалідаваныя намаганні мясцовага супольніцтва вакол ідэі захавання традыцый і звычаяў Забалатчыны.

2. Павышэнне ўзроўню сацыяльных, даследчых кампетэнцый вучняў дзяржаўнай ўстановы адукацыі «Забалацкая сярэдняя школа імя Я.Н.Карпянкова».

3. Адраджэнне абрадаў, рытуалаў, гульняў жыхароў Забалаці, вечарын, забалацкіх, курчоўскіх і місявіцкіх традыцый святкавання народных свят.

4. Стварэнне відэафільма "Сцяжынкамі роднага краю".

5. Трансляцыя набытага апрацаванага матэрыялу ў сродках масавай інфармацыі, а таксама на сайце дзяржаўнай ўстановы адукацыі «Забалацкая сярэдняя школа імя Я.Н.Карпянкова ».

6. Папаўненне старонкі "Захаваем спадчыну для нашчадкаў" новымі матэрыяламі праекта "#Мынашчадкі" на сайце дзяржаўнай установы адукацыі "Забалацкая сярэдняя школа імя Я.Н.Карпянкова" з мэтай павышэння цікавасці падрастаючага пакалення да малой радзімы.

Ацэнка выніковасці праекта

1. Колькасныя паказчыкі:
-запатрабаванасць праекта;
-колькасць выкананых канкрэтных спраў і мерапрыемстваў (80% ад запланаваных);
-ахват жыхароў аг.Забалаць, аг.Місявічы і в. Курчоўцы ў час правядзення мерапрыемстваў (не менш за 50%).

2. Паказчыкі сацыяльнага развіцця асобы:
-станоўчая дынаміка ўроўню развіцця асобы: набыццё вучнямі навыкаў стражытных рамёстваў (вышыўкі, выцінанкі і інш.) для выкарыстання ў гаспадарчай дзейнасці і трансляцыі сацыяльна-культурнага вопыту продкаў; разуменне сутнасці абрадаў, зместу розных рытуальных сітуацый, практычнага прымянення вышыўкі, ткацкіх вырабаў як сродкаў упрыгожання жылля і адзення, ролі народных свят у сям'і, якасць фота- і відэапрадукцыі, друкаваных матэрыялаў, выкананых удзельнікамі.

3. Паказчыкі сацыяльнай адаптацыі асобы:
-набыццё ўменняў карысна арганізаваць свой вольны час;
-павышенне ўзроўню сацыяльнай паспяховасці ўдзельнікаў;
-павышэнне якасці падрыхтоўкі вучняў да сямейнага жыцця на прыкладзе традыцый сям'і і вёскі;
-актыўнасць жыхароў усіх узростаў у сацыяльна-культурным жыцці аграгарадка (вёскі).

4. Паказчыкі грамадскай думкі:
-папулярнасць праекта сярод прадстаўнікоў мясцовай супольнасці;
-краязнаўчы рэйтынг мясцовасці;

## Заключэнне

Сёння вялікая ўвага надаецца грамадзянскаму і патрыятычнаму выхаванню. А краязнаўства і турызм ствараюць добрыя ўмовы для выхавання любові да Бацькаўшчыны, так як яна заснавана на пачуцці любові да малой радзімы. Выхаванне грамадзянскасці і патрыятызму, нацыянальнай самасвядомасці фарміруецца не на пафасных фразах і паняццях, а на сістэме маральнага, інтэлектуальнага і пазнавальнага працэсаў.

На мой погляд, галоўным вынікам любой праведзенай работы з’яўляецца яе эфектыўнасць. Эфектыўнасць дзейнасці па выхаванні нацыянальнай самасвядомасці навучэнцаў, захаванні і адраджэнні мясцовых традыцый вынікае з наступнага:

1) дзецям падабаецца дадзеная дзейнасць, яна выклікае цікавасць;
2) бацькі задаволены дзейнасцю сваіх дзяцей, падтрымліваюць іх выбар;
3) назіраецца рост узроўню сфарміраванасці грамадзянскіх і патрыятычных якасцяў у навучэнцаў;
4) паказчыкамі эфектыўнасці выхавання нацыянальнай самасвядомасці навучэнцаў з’яўляецца выніковасць удзелу ў конкурсах, узнагароды;
5) публікацыі, якія сведчаць аб эфектыўнасці працы: “Захаваем спадчыну” “Воранаўская газета” (02.03.2005); артыкул “Беларускія вячоркі” і сцэнарый “Забалацкія вячоркі”, часопіс “Беларуская мова і літаратура” №12 2014 г; артыкул “Шархуны-шалестуны” ,“Настаўніцкая газета” (18.04.2020); артыкул “Вячоркі ў Курчоўцах” “Воранаўская газета” (02.03.2020) артыкул “Вячоркі ў Місявічах” “Воранаўская газета” (05.05.2020) і інш. (Дадатак 8).

Трэба яшчэ дадаць, што ў краязнаўчых справах вельмі важна не толькі збіранне інфармацыі ці рэчаў, але і іх сістэматызацыя, аналіз, параўнанне з агульнымі працэсамі ў гісторыі Айчыны і сусветнай гісторыі, выяўленне агульнага і адметнага.

Праведзеная работа паказала адметнасць культурнай спадчыны на Забалаччыне. Адсюль разуменне, у чым унікальнасць таго куточка зямлі, на якім мы жывем, чым тлумачыцца яго спецыфіка і непаўторнасць. Адметныя асаблівасці свайго рэгіёну мы павінны захаваць і перадаць будучым пакаленням.

Навучэнцы, з’яўляючыся даследчыкамі гістарычнага мінулага малой радзімы, яе культурнай і духоўнай спадчыны, традыцый, узбагачаюць свой інтэлект. Паколькі самі з’яўляюцца ўдзельнікамі такіх мерапрыемстваў, яны міжволі дакранаюцца да тонкіх струн душы свайго народа.

А сама жыццёвая практыка падказвае, што праведзеная праца па захаванні і перадачы традыцый ідзе ад душы праз супрацоўніцтва з другімі ўстановамі, якія аказваюць дапамогу ў арганізацыі і правядзенні краязнаўчай работы, выхоўваючы на прыкладзе вопыту продкаў падрастаючае пакаленне. Такім чынам, гіпотэза пацвердзілася поўнасцю.

І тую спадчыну, да якой мы далучаемся сёння, у будучым зможам перадаць наступным пакаленням, бо, як сказаў Змітрок Марозаў: “Пасля гадоў духоўнага зацьмення мы да вытокаў згубленых прыйшлі”.

Спіс выкарыстаных крыніц


1. Кірчук, І. І. Выхаванне на нацыянальных традыцыях: вучэб.-метад. дапаможнік для настаўнікаў, класных кіраўнікоў, выхавальнікаў, кіраўнікоў фальклорных і тэатральнных гурткоў / І. І. Кірчук. – Мінск: Нацыянальны інстытут адукацыі, 2008. – 192 с.
2. Кірчук, І.І., Лозка, А. Ю. Тэатралізаваныя школьныя святы / І.І. Кірчук, А.Ю. Лозка. – Мінск : БелЭн, 2004. – 176 с.
3. Коцік В.У. Беларускія вячоркі / В.У.Коцік // Беларуская мова і літаратура. – №12, 2014. – С.57
4. Коцік В.У. Выхаванне спадчынай / В.У.Коцік // Воранаўская газета. – 2005. – 2 сакавіка. – С.3
5. Коцік В.У. Вячоркі ў Забалаці: сцэнарый мерапрыемства / В.У.Коцік // Беларуская мова і літаратура. – №12, 2014. – С.58
6. Коцік В.У. Вячоркі ў Курчоўцах / В.У.Коцік // Воранаўская газета. – 2019. – 29 лютага. – С.4
7. Коцік В.У. Шархуны-шалестуны / В.У.Коцік // Настаўніцкая газета. – 2020. – 18 красавіка. – С.14
8. Лапкоўская, А.М. Нацыянальная культура як сродак фарміравання нацыянальнай самасвядомасці студэнтаў. // Вышэйшая школа: навукова-метадычны і публіцыстычны часопіс. – №1, 2015. – С.50-53
9. Лемцюгова, В.П. Тапонімы распавядаюць: навукова-папулярныя эцюды / В.П.Лемцюгова. // Мн.: Литература и Искусство, 2008. – 416 с.
10. Ліцьвінка, В.Д. Святы і абрады беларусаў. / В.Д. Ліцвінка, маст А.І.Дашкевіч. – Мн.: Беларусь, 1997. – 205 с.: іл.
11. Лозка, А.Ю. Беларускі народны каляндар. А.Ю.Лозка // Мн.: Полымя, 1992. –176 с.: іл.
12. Ракава, Л.В. Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай вёсцы. –Мн.: Ураджай, 2000, – 111 с.: іл.

Дадаткі

Дадатак 1.  Праект “Захаваем спадчыну для нашчадкаў”

Коцік В.У., Мар’янская Л.П. Праект “Захаваем спадчыну для нашчадкаў”
https://upk-zabolot.schools.by/pages/praekt-zahavaem-spadchynu-dlja-nashchadka

Дадатак 2. Радаводы сям’і














Дадатак 3. Зборнік песень в.Курчоўцы
Коцік В.У. Зборнік песень в.Курчоўцы
(выканаўцы: ансамбль “Курчоўскія напевы”)

Зборнік  песень знаходзіцца на сайце
https://upk-zabolot.schools.by/pages/zbornk-pesen-vkurchotsy

Дадатак 4. Інтэрв'ю з землякамі

Буйко В. Інтэрв'ю з землякамі

*Інтэрв'ю з мастацкім кіраўніком Курчоўскага Цэнтра культуры і вольнага часу Верай Іванаўнай Васько і самай сталай жыхаркай в.Курчоўцы Мацкевіч Геленай Балеславаўнай (84 гады).*

Мастацкі кіраўнік Курчоўскага Цэнтра культуры і вольнага часу Вера Іванаўна Васько, вопытны мастацкі кіраўнік, былы загадчык Курчоўскага ЦКіД, цікавая і прыветлівая жанчына, заўсёды рада гасцям, дапамагае ў правядзенні фальклорных святаў на сцэне, знаёміць з вытокамі мясцовых абрадаў.

Вось напярэдадні Свята птушак (19 сакавіка) навучэнцы завіталі ў госці да Веры Іванаўны.

- Вера Іванаўна, раскажыце, калі ласка, як адначалася ў Вашым дзяцінстве і як адзначаецца цяпер Свята птушак?

Вера Іванаўна распавяла такую прыпавецъ:

— Святы Юзэф быў апекуном Ісуса Хрыста, меў сталярную майстэрню, і вучыў Яго працаваць з дрэвам, таму 19 сакавіка трэба абавязкова рыхтаваць падарункі з дрэва для родных. А яшчэ святога лічаць абаронцам сям'і — дазваляецца ў гэты дзень не пасціцца і браць шлюб у касцёле. Другая назва свята — "Птушынае вяселле" — пайшла ўжо з народнага: раней у гэты час усе птушкі вярталіся з цёплых краёў і пачыналі будаваць гнёзды.

У клубе і цяпер шмат дзяцей збіраецца на святы. Асабліва з в. Курчоўцы.

Святога Юзэфа адзначаем ужо другі год, традыцыі збіралі з аповедаў старых, а цяпер у вёсцы ўжо нават малыя ведаюць, што ў гэты дзень птушачкі жэняцца".

У размову ўключаецца Мацкевіч Г.Б., цудоўная жанчына, майстрыха, ткачыха, вырабы якой былі прадстаўлены на рэспубліканскай выставе народнай творчасці (2019 г.), а таксама на беларускім тэлебачанні выйшла праграма з яе удзелам "Наперад у мінулае"…

Гелена Балеславаўна расказвае: "Дома дзень святога Юзэфа адзначалі і ў дзяцінстве і сёння адзначаю, ходзім у касцёл усёй сям'ёй, рыхтуем вярбу. Хлопцы і дзяўчаты зразалі галінкі вярбы — іх трэба было паставіць у ваду, а на Вербную нядзелю пайсці з імі ў касцёл.У гэты дзень гаспадыні рыхтавалі святочны стол, дзе галоўная страва — тушаная капуста з жабэркамі, пірагі і абавязкова печыва ў выглядзе птушачак. Для дзяцей у іх клалі капейкі".

— Гелена Балеславаўна, а раскажыце, як гатавалася гэтая капуста з цікавай назвай "жабэркі"?

—Жабэркі гэта так у нас называюць рэбры. У перакладзе з польскай мовы слова "*jaberki"* азначае "рэбры". Тушаная капуста з рабрынкамі гатавалася звычайна ў печы. Для падрыхтоўкі тушанай капусты з рабрынкамі нам спатрэбіцца: 500 г свіных рэбраў,1 сярэдні качан капусты, 2 цыбуліны,

2 морквачкі, можна 1ст. л. таматавай пасты, а раней клалі памідорчыкі. дабаўлялі лыжачку алею, а таксама клалі для смаку і паху спецыі па гусце:

2-3 лісцікі бабкоў, пару гарошын перчыку, тміну шчупчык. Ставілі ў печ на мінут 40 і ўжо праз паўгадзіны з печы ішоў такі пах, што аж язык заварочвала. А стравы, прыгатаваныя ў печы, вельмі смачныя і захоўваюць усе карысныя рэчывы. Я і зараз гатую многа чаго ў печы. Запрашаю ў госці, прыходзьце, калі ласка, паспрабуеце.

Наша гутарка прадаўжаецца і мы зноў вяртаемся да Свята птушак.

— Вера Іванаўна, а што яшчэ цікавага адбываецца на гэтае свята?

—А яшчэ на святога Юзэфа дзяўчаты варожаць на свой лёс: апоўначы выходзяць на вуліцу, мыюць твар вадой з калодзежа, выціраюцца новым ільняным ручніком і ціхенька, каб ніхто не заўважыў, вяртаюцца дадому — нельга ні з кім размаўляць. Калі ранкам дзяўчына пабачыць на акне птушыную пару — будзе ў яе доўгі моцны і шчаслівы шлюб…

Ведаеце, колькі ў нас на Воранаўшчыне ўсяго адбывалася? За такі кароткі час і не раскажаш. Народныя традыцыі паважаю, цікаўлюся, а яшчэ як мастацкі кіраўнік ЦКіД рыхтую святы згодна плана работы раённага аддзела культуры Воранаўскага райвыканкама. План брэндавых мерапрыемстваў даводзіцца да кожнай установы культуры на год., якая павінна прадставіць пэўны абрад ці свята. Згодна гэтага плана на працягу года можна наведаць вёскі і аграгарадкі Воранаўшчыны і даведацца шмат цікавага з гісторыі і традыцый края. Напрыклад, у мінулым годзе Забалацкі ЦКіД праводзіў тэтралізаванае свята “Прысмакі”, Місявічскі ЦДК – свята “Ручнікі”, Курчоўскі ЦКіД – свята “Землякі”, дзе актыўнымі ўдзельнікамі з’яўляліся вашы навучэнцы, іх бацькі і педагогі .

Сустрэча з цудоўнымі жанчынамі дала нам штуршок для яшчэ адной экскурсіі.



Дадатак 5.  Распрацоўкі ўрокаў, заняткаў, забаў, пазакласных мерапрыемстваў, сцэнарыяў свят і абрадаў

Матэрыялы знаходзіцца на сайце https://upk-zabolot.schools.by/pages/zanjatk-abjadnannja-spadchyna

Дадатак 5.1.   “У вянок роднай мове” да Міжнароднага дня  роднай мовы

Коцік В.У. Пасяджэнне  літаратурнага клуба “Пегасік” “У вянок роднай мове” да Міжнароднага дня  роднай мовы





Дадатак 6.  Фотаматэрыялы  фальклоных свят і абрадаў

Дадатак 6.1. Запрашаем на Камаедзіцу





Дадатак 6.2. Вялікдзень



Дадатак 6.3. Саракі




Дадатак 6.4. Курчоўскія калядкі





Дадатак 6.5. Забалацкі кірмаш







Дадатак 6.6. Вячоркі ў Забалаці





Дадатак 6.7. Уваходзіны







Дадатак 6.8. Багач





Дадатак 6.9. Масленіца




Дадатак 7. Фальклорнае свята “Вячоркі”
на тэлеканале БТ-3 у праграме “Наперад у мінулае”

Відэаматэрыялы https://www.youtube.com/watch?v=C4_kGiBsdX8

Фотаматэрыялы https://upk-zabolot.schools.by/photoalbum/817292

Дадатак 8. Выступленне на раённым жнівеньскім
педсавеце “Прэзентацыя ўстановы адукацыі”

Коцік В.У. Сцэнарый выступлення на раённым жнівеньскім педсавеце “Прэзентацыя ўстановы адукацыі”
https://upk-zabolot.schools.by/pages/stsenary-svjat-abrada-zabalatchyny

Дадатак 9. Відэаролік праекта “#Мынашчадкі”
https://youtu.be/orBAEB9V3L0 Аўтар Буйко Валерыя

Дадатак 10. Публікацыі ў сродках масавай інфармацыі
Коцік В.У. Публікацыі ў сродках масавай інфармацыі



# ВЫХАВАННЕ СПАДЧЫНАЙ




**В. У. КОЦІК,**
настаўніца навучальна-педагагічнага комплексу
«Забалацкія яслі-сад — сярэдняя школа»
Воранаўскага раёна, кіраўнік гуртка «Спадчына»


# БЕЛАРУСКІЯ ВЯЧОРКІ

Нашым гуртком «Спадчына» былі пастаўлены на сцэне народныя святы і абрады «Калядкі», «Масленіца», «Калыханка», «Вялікдзень» і інш. Сёння гэта фальклорна-этнаграфічна-тэатральная справа працягваецца.

Адно з цікавых мерапрыемстваў пад назвай «Вячоркі ў Забалаці» было падрыхтавана і прапанавана ўдзельнікамі гуртка для жыхароў Забалаці і шаноўных гасцей — настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры Воранаўскага раёна. На базе нашай школы праходзіла раённае настаўніцкае метадычнае аб'яднанне.

У прызначаны дзень гледачы пачалі запаўняць залу задоўга да пачатку. У стылі сялянскай хаты была прыгожа аформлена сцэна: канапа, лавы, куфэрак, посцілкі, абрусы. Можна было пабачыць шмат былых прылад працы і рэчаў штодзённага ўжытку: калаўротак, прасніцы, верацёны, збаны, гаршкі, фіранкі, сурвэткі, ручнікі, вытканыя нашымі бабулямі.

Вядучыя расказалі ўсім прысутным аб тым, як нашы продкі праводзілі вячоркі ў Забалаці. Як правіла, у прасторнай хаце збіралася моладзь, а таксама сюды наведваліся старэйшыя жыхары. У доўгія восеньскія і зімовыя вечары жанчыны пралі, выконвалі разам іншую працу. На вячорках людзі гаманілі, паведамлялі навіны, марылі аб лепшай будучыні. Спявалі песні, ладзілі скокі, гульні, тут чуліся вясёлыя жарты.

...Вячоркі распачаліся. Гасцей шчыра сустракалі апранутыя ў беларускія нацыянальныя строі гаспадары дома Лявон, Лявоніха і іх дачушка Васілінка. Першымі на вячоркі завіталі дзяўчаты з Забалаці і, вядома ж, галоўная дзейная асоба — гарманіст. І загучала ў зале беларуская песня «Цячэ вада ў ярок». А затым на вячоркі прыйшлі новыя госці — хлопцы. І адразу пацешылі гаспадароў ды іншы люд песняй «Як павёў мяне Цімох», якую не толькі прыгожа праспявалі, але і праінсцэніравалі. Весела на вячорках было ўсім: і гледачам, і артыстам.

Кожны госць прыносіў свае стравы. І чаго тут толькі не было! Дранікі і бабка, бліны і варэнікі, паляндвіца і агуркі, клёцкі і хатнія каўбасы... А гаспадары частавалі гасцей пірагамі і квасам.

Запрасіла Васілінка на вячоркі і сваю бабулю. Пачулі госці ад бабулі цікавыя гісторыі з яе дзяцінства, яна расказала пра тое, якую ролю ў жыцці чалавека адыгрывае парог. Шмат прагучала прыкмет пра парог у хаце і пра тое, як жылі нашы дзяды і прадзеды ў мінулым, у што верылі і чаго баяліся.

А якія ж вячоркі без танцаў? Не ўтрымаліся хлопчыкі і пайшлі запрашаць на «Кракавяк» дзяўчынак.

Але гэта былі яшчэ не ўсе госці. Несцерка завітаў «на агеньчык» з прыгаворкамі і цэлым мехам загадак. Затым, пачуўшы гучны смех і жарты, зайшла на хвілінку моладзь з вёскі Курчоўцы (вучні старшых класаў). Яны парадавалі ўсіх беларускімі танцамі «Варотцы» і «Полька-весялуха» (мастацкі кіраўнік Л. І. Юшэвіч). Пачалі танцаваць полечку гледачы. Несцерка не стрымаўся і кінуўся ў скокі. Так спадабаліся яму хлопцы і дзяўчаты, што доўга не адпускаў іх. Прапанаваў свае загадкі, хоць не ўсе іх адгадалі. Гаспадары пачаставалі танцораў, і тыя адправіліся ў дарогу. А вячоркі яшчэ доўжыліся.

Беларускія загадкі, прыказкі, неверагодныя вясковыя гісторыі з жыцця нашых бабуль і дзядуляў, байкі і анекдоты гучалі са сцэны ў выкананні юных артыстаў. Байка «Свіння і Баран» выклікала шквал апладысментаў у зале.

Гулялі дзяўчынкі і хлопчыкі ў беларускія народныя гульні: «Яшчар», «Маша», «Баба Яга» і інш.

Напрыканцы вячорак прагучала песня «Бывайце здаровы».

Узнагарода ўдзельнікам вячорак — бурныя і працяглыя воплескі, а гледачам — добры настрой і надзея, што такія святы стануць рэгулярнымі. Станоўча ацанілі мерапрыемства настаўнікі раёна Я. Ч. Гражынская, І. Ф. Габіс, Т. С. Ярмак, С. Ю. Кампанеец і інш. Лілія Яўгеньеўна Бартось, маці вучаніцы 5 «А» класа, сказала наступнае: «На мой погляд, свята сапраўды атрымалася. Дзеці выступалі як сапраўдныя артысты. А я на некаторы час вярнулася ў дзяцінства. Успомніла ціхія зімовыя вечары, калі ў нашай вёсцы збіралася на вячоркі моладзь. І тады гучалі беларускія і польскія песні, чуліся смех і жарты хлопцаў і дзяўчат. І ўсім было весела. Сёння шкада сучасную моладзь, бо іншы раз ім няма куды пайсці, а таму сядзяць пры камп'ютарах. А спадчыну трэба захоўваць і вывучаць, каб перадаць яе ўнукам і праўнукам».

...Мерапрыемства праляцела як адно імгненне. Скончылася падарожжа ў мінулае. Дзеці нагадалі нам, што мы, беларусы, маем багатую народную спадчыну, якой варта ганарыцца і якую неабходна прапагандаваць.

